# ЭКАЛАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА ПАДЛЕТКАЎ – ЧЫТАЧОЎ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК: УЗРОЎНІ ФАРМІРАВАННЯ

**В.А.Какшынская,** *аспірантка, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў*

З мэтай эфектыўнага фарміравання экалагічнай культуры чытачоў-падлеткаў, прасочвання яе дынамікі і выніковасці неабходна вылучыць узроўні яе развіцця.

У аснову вылучэння ўзроўняў экалагічнай культуры падлеткаў намі пакладзены структурна-функцыянальныя прыметы, якія праяўляюцца ў змяненні структуры і функцый экалагічнай культуры пры яе пераходзе на новы ўзровень. Пераход экалагічнай культуры на больш высокі ўзровень азначае не знікненне інтэграцыйных якасцей папярэдняга ўзроўню, а пераўтварэнне іх у больш дасканалыя. Ацэначнымі крытэрыямі ўзроўняў экалагічнай культуры выступаюць тэарэтычна распрацаваныя паказчыкі сфарміраванасці якасцей асобы падлетка.

Для разгляду сутнасці ўзроўняў экалагічнай культуры звернемся да эталонных змястоўных паказчыкаў і звяжам іх з асноўнымі сферамі індывідуальнасці асобы: інтэлектуальнай, матывацыйнай, прадметна-практычнай і экзістэнцыяльнай [1].

Інтэлектуальную сферу складаюць якасці розуму, пазнавальныя працэсы, мысліцельныя аперацыі, вучэбныя ўменні. Паказчыкамі экалагічнай культуры ў інтэлектуальнай сферы з'яўляюцца аб'ём, глыбіня, дзейснасць, сістэмнасць ведаў аб асноўных экалагічных каштоўнасцях, законах, паняццях і ўяўленнях аб месцы чалавека ў свеце прыроды, аб абавязку аховы прыроды, аб экалагічнай адказнасці не толькі за сябе, але і за ўсё жывое, развітыя пазнавальныя ўменні, гнуткасць розуму (кампетэнтнасць, гуманнасць, умеранасць, дальнабачнасць).

Матывацыйная сфера ўключае ўсю сукупнасць патрэб, матываў і жаданняў чалавека. Усвядомленасць матываў паводзін і дзеянняў, накіраваных на выкананне экалагічных нормаў, дазваляе індывіду мэтанакіравана будаваць узаемаадносіны з сацыяльным і прыродным асяроддзем. Гэтыя ўзаемаадносіны характарызуюцца беражлівымі адносінамі да ўсяго жывога (у тым ліку да чалавека), спалучэннем асабістых і грамадскіх інтарэсаў, жыццём у згодзе і гармоніі з прыродай; экалагічнымі ўстаноўкамі на непрагматычнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзаемадзеянне з прыродай; прызнаннем каштоўнасці чалавечага жыцця.

Прадметна-практычная сфера ўключае здольнасці, учынкі, уменні падлеткаў у розных сферах дзейнасці і зносінах. Развітая прадметна-практычная сфера дазваляе чытачу здзяйсняць духоўныя экалагічныя ўчынкі; праяўляць адказныя адносіны да сацыяпрыроднага асяроддзя; ацэньваць з духоўных пазіцый асабістыя экалагічныя ўчынкі, паводзіны членаў грамадства з пункту гледжання экалагічных нормаў.

Пазіцыі і арыентацыі, з якімі індывід уступае ў зносіны з сацыяльным і прыродным асяроддзем, вызначаюць сутнасць яго экзістэнцыяльнай сферы. Паказчыкамі экалагічнай культуры выступаюць наяўнасць пазітыўнай канцэпцыі "Эка-Я" і самапавагі; уважлівыя адносіны да людзей, да ўсяго жывога ў прыродзе; узгадненне патрэб чалавека з экалагічнымі патрабаваннямі; непрагматычная арыентацыя ва ўзаемадзеянні з прыродай.

У кожнай з абазначаных сфер індывідуальнасці асобы мы вылучаем тры ўзроўні экалагічнай культуры падлеткаў: нізкі, сярэдні і высокі.

Падлеткі, якія засвоілі толькі апісанне аб'ектаў экалагічнага вывучэння, якія могуць толькі ўзнавіць экалагічныя факты, з'явы, малюнкі, схемы, тэксты, тэрміны, прыметы паняццяў, адносяцца да групы з нізкім узроўнем развіцця экалагічнай культуры ў інтэлектуальнай сферы. Авалоданне падлеткамі ўменнем перадаваць паўнату і паслядоўнасць тлумачэння экалагічных законаў, паняццяў, але няздольнасць пераўтвараць экалагічную інфармацыю – паказчыкі сярэдняга ўзроўню экалагічнай культуры. Высокаму ўзроўню развіцця экалагічнай культуры ў інтэлектуальнай сферы адпавядае ўменне пераўтвараць экалагічную інфармацыю, што дазваляе падлеткам авалодваць прасцейшымі прыёмамі прагназавання, развіваць гнуткасць розуму і пазнавальныя ўменні, правільна выбіраць шляхі рашэння экалагічных задач і заданняў.

Для падлеткаў з нізкім узроўнем развіцця экалагічнай культуры ў матывацыйнай сферы характэрны малая ступень або адсутнасць усвядомленасці матываў, патрэб і мэты выканання экалагічных нормаў; слабая сфарміраванасць або адсутнасць матываў прыродаахоўнай дзейнасці; неразуменне значнасці ўсеагульных намаганняў прыродаахоўнай дзейнасці для макрасацыяльных працэсаў. Падлеткаў з сярэднім узроўнем развіцця матывацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экалагічнай культуры характарызуюць разуменне мэты выканання экалагічных нормаў, у аснове якой – антрапацэнтрычнае ўяўленне аб навакольным свеце; усведамленне значнасці ўсеагульных, але неразуменне значнасці асабістых намаганняў у прыродаахоўнай дзейнасці для макрасацыяльных працэсаў (асабістай адказнасці за стан сацыяпрыроднага асяроддзя). Групу падлеткаў-чытачоў з высокім узроўнем развіцця экалагічнай культуры ў матывацыйнай сферы характарызуюць: усвядомленасць мэты выканання экалагічных нормаў; развітая перакананасць у неабходнасці выканання экалагічных патрабаванняў; развітыя непрагматычныя матывы актыўнай прыродаахоўнай дзейнасці; разуменне значнасці асабістых намаганняў для макрасацыяльных працэсаў.

Нізкі ўзровень развіцця экалагічнай культуры падлеткаў у прадметна-практычнай сферы характарызуецца наяўнасцю адзінкавых або адсутнасцю сфарміраваных экалагічных навыкаў і ўменняў, выкананнем экалагічных нормаў у некаторых відах дзейнасці; адсутнасцю экалагічных учынкаў у практычнай экалагічнай дзейнасці. Для падлеткаў з сярэднім узроўнем развіцця экалагічнай культуры ў прадметна-практычнай сферы характэрны адсутнасць сфарміраванай сістэмы экалагічных навыкаў і ўменняў, развіццё асобных груп спосабаў і прыёмаў рацыянальнай экалагічнай дзейнасці; нерэгулярнасць здзяйснення экалагічных учынкаў і эпізадычнасць удзелу ў практычнай экалагічнай дзейнасці. Да высокага ўзроўню развіцця вышэйназванай сферы адносяцца чытачы-падлеткі, якія валодаюць сістэмай навыкаў і ўменняў рацыянальнай экалагічнай дзейнасці, выконваюць экалагічныя нормы ва ўсіх відах дзейнасці.

Падлеткі з нізкім узроўнем развіцця экалагічнай культуры ў экзістэнцыяльнай сферы характарызуюцца адсутнасцю экалагічных мэт у жыцці, цікавасці да працэсу экалагічнай напоўненасці жыцця і яго эмацыянальнай насычанасці, недастаткова развітой здольнасцю самапавагі і павагі да людзей. Для падлеткаў з сярэднім узроўнем экалагічнай культуры характэрна наяўнасць негатыўнай канцэпцыі “Эка-Я”, згодна з якой сусвет створаны толькі для чалавека. У дзяцей гэтай групы недастаткова развіты здольнасці сацыяльнага ўзаемадзеяння: супрацоўніцтва, партнёрства, узаемадапамогі, узаемападтрымкі, асабістай адказнасці. Падлеткі, якія валодаюць высокім узроўнем экалагічнай культуры ў разглядаемай сферы, характарызуюцца дамінаваннем экалагічных каштоўнасцей: пазітыўная канцэпцыя “Эка-Я”, згодна з якой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чалавек ёсць арганічная частка прыроды. У падлеткаў гэтай групы добра развіты здольнасці самапавагі і павагі да людзей. Для іх характэрна сфарміраванасць навыкаў сацыяльнага ўзаемадзеяння (супрацоўніцтва, партнёрства, узаемадапамогі, узаемападтрымкі, асабістай адказнасці).

З улікам вышэйсказанага пададзім абгрунтаваныя характарыстыкі падлеткаў-чытачоў розных узроўняў развіцця экалагічнай культуры [2].

Нізкі ўзровень. Падлетак ведае нормы, паняцці, законы павярхоўна; не знаходзіць прычын, умоў і вынікаў экалагічных з’яў; не ўмее пераасэнсоўваць інфармацыю. У яго адсутнічаюць або ён слаба ўсведамляе матывы і мэты, накіраваныя на выкананне экалагічных нормаў. На нізкім узроўні для падлетка характэрны авалоданне асобнымі ўменнямі і навыкамі рацыянальнай экалагічнай дзейнасці; адсутнасць экалагічных каштоўнасцей; не развіты здольнасці сацыяльнага ўзаемадзеяння. У падлетакў на нізкім узроўні сфарміраваны асобныя экалагічныя рысы. Паводзіны яго характарызуюцца дэструктыўнымі паказчыкамі.

Сярэдні ўзровень. Экалагічныя каштоўнасці, нормы, паняцці, законы ў асноўным разумеюцца правільна. Падлетак добра ведае і апісвае сацыяэкасістэму, умее тлумачыць экалагічныя з’явы, валодае гнуткасцю розуму, але дрэнна ўмее пераасэнсоўваць інфармацыю. Матывацыяй выканання экалагічных нормаў у прыродаахоўнай дзейнасці выступаюць асноўныя фізіялагічныя патрэбы (у бяспецы, прызнання, прагматычныя). Развіты асобныя групы ўменняў і навыкаў рацыянальнай экалагічнай дзейнасці; недастаткова развіты здольнасці сацыяльнага ўзаемадзеяння. Для падлеткаў на сярэднім узроўні характэрна сфарміраваная сістэма экалагічных якасцей асобы. Паводзіны у цэлым адпавядаюць прынцыпам экалагічных каштоўнасцей.

Высокі ўзровень. Для падлеткаў характэрны правільнае разуменне і глыбокія веды кампанентаў, законаў, працэсаў і з’яў сацыяэкасістэм. Гнуткасць розуму выяўляецца ў працэсе пераасэнсоўвання экалагічнай інфармацыі; матывацыяй выканання экалагічных нормаў у прыродаахоўнай дзейнасці служаць як асноўныя патрэбы, так і непрагматычныя мэты. Падлеткі валодаюць разнастайнымі ўменнямі і навыкамі рацыянальнай экалагічнай дзейнасці, у іх развіта здольнасць самапавагі і павагі да людзей, сфарміравана цэласная сістэма экалагічна значных рыс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобы, паводзіны характарызуюцца функцыянальнай аптымальнасцю ва ўзаемадзеянні з сацыяпрыродным асяроддзем.

Такім чынам, эталонная мадэль экалагічна культурнага падлетка наступная. Ён:

– валодае аб’ёмнымі, глыбокімі, дзейснымі ведамі аб асноўных экалагічных каштоўнасцях, кампетэнтны, дальнабачны, гуманны, сціплы, усведамляе адказнасць за сябе і ўсё жывое;

– выконвае ў паўсядзённай і практычнай дзейнасці экалагічныя нормы, праяўляе беражлівасць, умеранасць, прыстойнасць;

– перажывае глыбокія і разнастайныя пачуцці: літасць, радасць, спагадлівасць, самалюбства, эмпатыю, сорам і інш.;

– самастойны, мужны, смелы, прынцыповы ў адстойванні экалагічных каштоўнасцей;

– пры вызначэнні правамернасці экалагічнага выбару кіруецца пачуццямі сумлення, самакрытычнасці, адэкватнай самаацэнкай; умее суаднесці свае паводзіны з экалагічнымі патрабаваннямі; добраахвотна і свабодна выконвае экалагічныя патрабаванні; валодае здольнасцямі самакантролю і рэфлексіі;

– умее ацаніць паводзіны сучаснікаў з пункту гледжання экалагічных нормаў, валодае спосабамі і прыёмамі рацыянальнай экалагічнай дзейнасці; крытычны, сумленны ў адносінах да сацыяпрыроднага асяроддзя; валодае пазітыўнай пазіцыяй “Эка-Я”;

– паважліва адносіцца да людзей, да ўсяго жывога ў прыродзе; валодае навыкамі сацыяльнага ўзаемадзеяння з мэтай захоўвання прыроднага асяроддзя і яго далейшага развіцця пры абмежаваных рэсурсных магчымасцях планеты; умее ўзгадняць свае патрэбы з экалагічнымі патрабаваннямі; ва ўзаемадзеянні з сацыяльным і прыродным асяроддзем праяўляе непрагматычную арыентацыю.

Вылучэнне ўзроўняў развіцця экалагічнай культуры падлеткаў-чытачоў дае магчымасць бібліятэкару дыягнаставаць іх экалагічную культуру і на гэтай аснове прагназаваць магчымыя вынікі экалагічнага выхавання, стымуляваць развіццё асноўных сфер і фарміраванне асабістых якасцей у экалагічна нявыхаваных падлеткаў, падлеткаў з нізкім і сярэднім узроўнямі развіцця экалагічнай культуры.

---

*1. Глушкова, Л.С.* Формирование экологической воспитанности школьников: дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Л.С.Глушкова. – Калининград, 1999.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Шумейко, А.А.* Становление экологического менталитета современных школьников: теория и практика / А.А.Шумейко. – Брянск; Мозырь: Белый ветер, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ